П. М. САПОЦЬКА

# КАСЦЁЛЫ Ў ЛАГОЙСКУ І ВАЛОЖЫНЕ ЯК ВЫНІК МЕЦЭНАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ТЫШКЕВІЧАЎ / VOLOŽINO IR LOHOYSK BAŽNYČIAI KAIP TIŠKEVIČIŲ LABDAROS VEIKLĄ

P. SAPOTKA

# THE CHURCHES IN LAGOYSK AND VALOZHIN AS A RESULT OF PHILANTHROPIC ACTIVITIES OF TYSHKEVICH FAMILY

*Representatives of the Tyshkevich family were highly educated and cultured people, engaged in philanthropic activities: supported art and science financially, opened a museum, built temples. Among them the Church of the Nativity of the Blessed Virgin Mary and St. Kasimir in Lagoysk (founder – Alexander Tyshkevich) and St. Joseph's Church in Valozhin (founder – Yusaf Tyshkevich). The sacred places were destroyed several times, restored and rebuilt. Today these churches included in the list of historical and cultural heritage of the Republic of Belarus and are unique monuments of material cultural heritage of Belarus.*

Графскаму роду Тышкевічаў належалі гарадскія рэзідэнцыі і палацы ў Вільні, Варшаве, Кракаве, Паланзе, Лентварысе, Ужутракісе, Біржаях, Лагойску. У Беларусі яны валодалі Астрашыцкім Гарадком, Валожынам і іншымі гарадамі і мястэчкамі. Значную частку фінансавых сродкаў яны ўкладвалі ў будаўніцтва хрысціянскіх храмаў, сярод іх – касцёлы ў Лагойску і Валожыне.

Лагойск перайшоў у валоданне Тышкевічаў у 1517 г., калі граф Васіль Тышкевіч, ваявода падляскі і смаленскі, староста мінскі і пінскі, атрымаў горад у якасці пасагу жонкі Аляксандры з роду Чартарыйскіх, зрабіўшы яго пасля сваёй рэзідэнцыяй.

Касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Казіміра ў Лагойску быў заснаваны ў 1609 г. Аляксандрам Юр’евічам Тышкевічам у знак пераходу ў каталіцкую веру.

Як і шматлікія святыні, пабудаваныя на беларускіх землях, лагойскі храм некалькі разоў руйнаваўся і ўзводзіўся зноў. Першы, драўляны, касцёл згарэў падчас вайны паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй у 1655 г. Адноўлены на працягу некалькіх гадоў, ён зноў быў знішчаны падчас Паўночнай вайны ў 1706 г.

Праз тры гады узнёсся новы касцёл. Ён уяўляў сабой крыжападобны зруб з двума сакрысціямі (рызніцамі), згодна слоўніку – «адмысловымі памяшканнямі, дзе захоўваюцца цар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

коўныя рэчы, набажэнскі ўбор светароў, кнігі і г.д.». «Франтальны фасад фланкіравалі дзве вежы. Змешчаны паміж імі трохкутны франтон і алтарная частка завяршаліся сігнатуркай – невялікай вежай са званом. Інтэр’ер упрыгожвалі двух’ярусныя жывапісныя алтары. Столь у святыні была падвесная, на бэльках. Інтэр’ер касцёла ўпрыгожвалі чатыры двух’ярусныя, “на оптыку пісаныя”, алтары» [2]. Каля храма знаходзілася двух’ярусная драўляная званіца. Пры касцёле дзейнічалі прыхадская школа, шпіталь, братэрства Сэрцы Езуса. Пад храмам размяшчаўся фамільны магільны склеп роду Тышкевічаў. Побач з храмам знаходзіцца магіла графа Канстанціна Тышкевіча, на якой усталяваны помнік.

У 1787 г. Аляксандр Тышкевіч узяўся за ўзвядзенне мураванага касцёла, будаўніцтва якога было завершана ў 1793 г. ужо яго сынам Вікенціем. Касцёл пабудаваны ў стылі класіцызму. «На бакавых фасадах выступалі крылы трансэпта – папярочных нефаў, якія перасякаюць пад прамым вуглом падоўжаныя нефы – пад двухсхільнымі пакрыццямі. Франтальны фасад завяршаў чатырохкалонны порцік з трохкутным франтонам, над якім узвышалася званіца з гадзіннікам» [2], перанесеным сюды са скасаванай лагойскай ратушы. У цэнтральнай аркавай эксэдры (паўкруглай нішы з месцамі для сядзенняў) была змешчана скульптура Езуса. Такое ж рашэнне мелі алтары ў крылах трансэпта – святога Антонія і Бязгрэшнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі. У крыпце пад касцёлам знаходзілася велічнае Распяцце. Галоўны алтар быў выкананы ў тэхніцы ілюзіяністычнага жывапісу, павялічваючы прастору інтэр’ера і надаючы яму тым самым адмысловы сэнс. У 1843 г. сюды прывезлі рэліквіі святога Казіміра.

На пачатку XX ст. прыход у Лагойску налічваў больш за пяць з паловай тысяч вернікаў. Абслугоўвалі прыход капліца на Лагойскіх прыхадскіх могілках, а таксама капліцы ў Емяльянаве і Тадуліне (зараз Смалявіцкі раён). Яшчэ адна капліца, збудаваная ў 1814 г., знаходзілася ў панскім доме палаца Тышкевічаў.

Мураваны храм існаваў да сярэдзіны XX ст. Пяцідзесятыя гады паўтарылі лёс ранейшых стагоддзяў: на гэты раз па загаду савецкіх улад касцёл зачынілі, а затым разбурылі. Была знішчана крыпта.

У канцы 1980-х гг. на месцы храма вернікамі быў пастаўлены крыж. У 1991 г. рашэннем гарадскіх улад землі перададзены каталіцкай царкве, пачалося будаўніцтва храма па праекце архітэктара М. Калечыца, якое завяршылася ўлетку 1999 г. 19

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэрвеня касцёл быў зноў асвечаны ў гонар Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Казіміра. Таксама прыбудавана вежа-званіца.

На дадзены момант неагатычны касцёл з’яўляецца візітнай карткай Лагойска і належыць Барысаўскаму дэканату Магілёўскай архідыяцэзіі.

Таксама адным з храмаў, пабудаваных дзякуючы намаганням Тышкевічаў, быў касцёл святога Юзэфа ў Валожыне. Яшчэ ў канцы XV ст. уладальнікам Валожына, буйным дзяржаўным дзеячам ВКЛ Альбрэхтам Гаштольдам быў заснаваны драўляны храм. Праз два стагоддзі пабудаваны другі будынак касцёла і манастыр бернардынцаў.

У розны час горадам валодалі Радзівілы, Слушкі, Чартарыйскія. У 1803 г. Валожын пераходзіць да Тышкевічаў. І тады ж віленскім старостай Юзафам Тышкевічам пачалося будаўніцтва касцёла, а скончылася пры яго сыне Міхале ў 1815 г. Пабудаваны ў стылі класіцызму на месцы касцёла, існаваўшага пры манастыры бернардынцаў (1681–1832) і пацярпелага падчас пажару, будынак адрозніваўся строгімі формамі і багатым строем.

Архітэктурнае рашэнне касцёла было ўнікальным і незвычайным для таго часу. Аднымі з галоўных адметных асаблівасцей будынка, падобнага на старажытнагрэчаскі храм, былі цэнтральны ўваход з дарыйскім порцікам і шасцю калонамі і масіўныя вароты-званіца, увенчаныя франтонам. «На сцяне – чатыры аркавыя нішы, у якіх раней знаходзіліся скульптурныя малюнкі евангелістаў. Касцёл накрыты двухсхільным дахам, над алтарнай часткай якога пабудавана кантаваная каркасная сігнатурка-ліхтарык» [1, с. 199]. Інтэр’ер падзелены магутнымі аркадамі на тры падоўжаныя нефы, перакрытыя цыліндрычнымі скляпеннямі на падпружных арках і распалубках. У арках змешчаны тры бронзавыя званы. Ёсць пяць алтароў, галоўны з якіх асвечаны ў імя Святога Езуса; захаваўся арган. Пад харамі размяшчаўся сямейны магільны склеп Тышкевічаў, дзе быў пахаваны і заснавальнік храма Юзаф Тышкевіч.

У 1864 г. касцёл быў зачынены царскімі ўладамі, яго будынак перададзены праваслаўнай абшчыне і неўзабаве пераасвечаны ў царкву святога праведнага Іосіфа Абручніка, а капліца на могілках стала царквой Праўтварэння Гасподня. Гэты працэс суправаджаў масавы пераход вернікаў касцёла ў праваслаўную веру ў 1864–1865 гг. і павелічэнне прыходу да шасці тысяч чалавек.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Толькі з уваходжаннем тэрыторыі Беларусі ў склад Рэчы Паспалітай католікам атрымалася вярнуць сваю святыню. У 1920-х гг. рабіліся спробы будаўніцтва новага храма, бо ўмяшчальнасць ранейшага была відавочна недастатковай. Аднак адсутнасць на той момант добрага архітэктара, здольнага распрацаваць праект новага збудавання, а таксама ў сувязі з цяжкім палітычным становішчам не ўяўлялася магчымым ажыццявіць дадзены намер.

У 1941 г. пасля заняцця Валожына нямецка-фашысцкімі захопнікамі вернікі вырашылі ажыццявіць сваю даўнюю задумку. Для арганізацыі будаўнічых работ нават быў створаны царкоўна-будаўнічы камітэт. У ваенным часе меліся шматлікія перашкоды для будаўніцтва, а з прыходам Чырвонай Арміі яно і зусім было прыпынена.

Існуючы храм у Вялікую Айчынную вайну быў моцна пашкоджаны, а ў пасляваенны час зачынены. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў будынак храма функцыянаваў як вытворчае памяшканне, у ім размяшчаліся склады адной з гандлёвых арганізацый, пасля там знаходзіўся цэх будаўнічай арганізацыі «Міжкалгасстрой», філіял ААТ «Мінскі завод “Тэрмапласт”».

Пагоршыла сітуацыю ўведзенае ўладамі правіла, у адпаведнасці з якім у адным населеным пункце не павінна быць больш чым адзін храм. На тэрыторыі Беларусі зачыняліся каталіцкія і праваслаўныя святыні, скасоўваліся прыходы, забараняліся набажэнствы, у тым ліку і ў Валожыне.

Культавае збудаванне вярнулі вернікам у 1991 г. Тады ж пачалася рэканструкцыя будынка, якая доўжылася некалькі гадоў. Касцёл належыць да Ивянецкаага дэканата Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі.

Сёння абодва касцёлы ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і з’яўляюцца ўнікальнымі помнікамі матэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

1. *Каласоўская, А. М.* Валожынскі касцёл святога Юзафа / А. М. Каласоўская // Культура Беларусі : энцыкл. – Мінск : БелЭн, 2011. – Т. 2. – С. 199.
2. Костел св. Казимира в Логойске // Виртуальный музей города Логойска. – URL: http://museum.logoysk.info/ru/city-history/2-religion/1152-catholic-church-of-st-casimir-in-logoysk.html.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ